*С. В. Зыгмантовіч,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# КАШТОЎНАСНА АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД У БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК

Тэхналагічная рэвалюцыя, якая забяспечвае высокі ўзровень інфармацыйных тэхналогій, і распаўсюджванне камп'ютарнай тэхнікі прывялі да мнагакратнага ўзмацнення значэння інфармацыі і ведаў для грамадскага развіцця. І ў гэтым грамадстве – грамадстве ведаў – місія бібліятэкі вызначаецца неабходнасцю садзейнічаць выкарыстанню і развіццю назапашаных чалавецтвам ведаў шляхам забеспячэння вольнага і ўсеагульнага доступу да іх, захавання дакументаваных ведаў як грамадскага здабытку.

Бібліяграфічная дзейнасць сваімі сродкамі садзейнічае рэалізацыі азначанай місіі бібліятэкі. І для бібліяграфічнай дзейнасці сучасныя тэхналогіі прадастаўляюць новыя магчымасці генерыравання гэтых сродкаў, рэалізацыі працэсаў фарміравання і выкарыстання бібліяграфічных рэсурсаў:

– на другасным узроўні фарміруецца сістэма, здольная забяспечыць праз развіццё нацыянальнай бібліяграфіі, аб'яднаных бібліяграфічных рэсурсаў, размеркаванай сістэмы зводных каталогаў доступ да ведаў, якія захоўваюцца ў дакументаванай форме ў любым кутку планеты;

– выкарыстоўваюцца новыя формы і носьбіты прадастаўлення бібліяграфічнай інфармацыі;

– пашыраецца спектр ствараемых бібліяграфічных прадуктаў (электронныя каталогі, базы даных, пуцевадзіцелі па інтэрнэт-рэсурсах і інш.);

– стала магчымым захоўванне значнай па аб'ёме інфармацыі, прычым рознай па сваім характары, на адным носьбіце;

– забяспечваецца аб'яднанне бібліяграфічнай, паўнатэкставай і фактаграфічнай інфармацыі ў адной базе даных;

– значна пашыраюцца традыцыйныя магчымасці пошуку дакументаў па генерыруемым бібліяграфічным рэсурсе;

– павышаюцца аператыўнасць бібліяграфічнага пошуку і аператыўнасць доступу і атрыманння паўнатэкставага кантэксту, у тым ліку і аддаленых рэсурсаў;

– пашыраюцца камунікатыўныя каналы прадастаўлення бібліяграфічнай інфармацыі, сярод якіх да найбольш значных сёння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можна аднесці вэб-сайт бібліятэкі або карпаратыўны партал, які забяспечвае адзіную кропку доступу да сукупных рэсурсаў, электронную пошту, сацыяльныя сеткі, блогі;

– сучасныя інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі дазваляюць рэалізаваць прынцып «адзіная кропка ўваходу – пошук у сукупных рэсурсах – прадастаўленне патрабуемага выніку»;

– павышаецца камфортнасць прадастаўлення бібліяграфічнай інфармацыі ў адпаведнасці з пажаданнямі карыстальнікаў.

Вызначанае развіццё бібліяграфічнай дзейнасці звязана з рэалізацыяй пераважна інфармацыйнай функцыі бібліятэкі. Інфармацыйная трактоўка сутнасці бібліятэкі сёння з'яўляецца найбольш папулярнай сярод значнай колькасці вучоных, кіраўнікоў і практыкаў. С. А. Басаў указвае, што з энтузіязмам падхапіў эфектны тэзіс ЮНЕСКО: «Бібліятэка з'яўляецца сэрцам інфармацыйнага грамадства», што бібліятэчная супольнасць у апошнія гады накіроўвае асноўныя інтэлектуальныя намаганні на абмеркаванне тэхналагічных пытанняў бібліятэчнай работы, будуе на інфармацыйнай аснове адукацыйныя праграмы і канцэпцыі бібліятэчнай справы [1, с. 6]. Разам з тым, на яго думку, «у постіндустрыяльным грамадстве бібліятэка павінна быць накіравана на выкананне гуманістычнай, а не інфармацыйнай місіі» [1, с. 21]. З развіццём інфармацыйных тэхналогій узрастае роля бібліятэкі як культурнага цэнтра, якая асэнсоўваецца і развіваецца ў кантэксце сацыякультурнага падыходу.

Сацыякультурны падыход дазваляе задаць гуманістычны вектар дзейнасці бібліятэк, яе арыентаванасць на развіццё творчых здольнасцей чалавека, каштоўнасных патрэбнасцей, арыентаванасць на агульначалавечыя фундаментальныя каштоўнасці і перадавыя навуковыя метады засваення, развіццё і сацыялізацыю гэтых каштоўнасцей.

Бібліяграфічная дзейнасць валодае патэнцыялам, які здольны аказаць падтрымку, забяспечыць рэалізацыю розных відаў актыўнасці бібліятэкі, у тым ліку інфармацыйную і сацыякультурную. Гэта знаходзіць сваё адлюстраванне як у тэарэтычных асновах, так і ў практычнай бібліяграфічнай дзейнасці, існаванні двух адносна самастойных відаў бібліяграфіі – агульнай і спецыяльнай. Першая – агульная – базіруецца на падрыхтоўцы бібліяграфічных крыніц, накіраваных на рэалізацыю пошукава-камунікатыўнай функцыі. Спецыяльная бібліяграфія арыентавана на стварэнне крыніц бібліяграфічнай інфармацыі ў дапамогу сацыякультурнай актыўнасці бібліятэкі і базіруецца на рэалізацыі ацэначнай функцыі, каштоўнасна-арыентацыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці бібліёграфа.

Аксіялагічныя аспекты ў асэнсаванні бібліяграфіі адлюстраваны ў працах М. А. Рубакіна, І. У. Уладзіслаўлева, С. А. Трубнікава, у інфармацыйна-дакументаграфічнай канцэпцыі А. П. Коршунава, кагнітаграфічнай канцэпцыі В. А. Факеева, інфармацыйна-культуралагічнай канцэпцыі М. Г. Вохрышавай. Сучасныя даследчыкі пры апісанні бібліяграфічнай каштоўнаснай арыентацыі найперш адзначаюць: гэта арыентацыя ў свеце тэкстаў як каштоўнасцей культуры з мэтай іх ідэнтыфікацыі і ацэнкі для вырашэння разнастайных сацыяльна-бібліяграфічных задач (6, с. 67). Бібліёграф адносіцца да дакументаваных тэкстаў як да культурных каштоўнасцей, якія маюць значэнне для карыстальніка, грамадства і здольны задавальняць пэўныя асабістыя і грамадскія патрэбнасці. У працэсе бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання бібліёграф часта выступае не проста як пасіўны пасрэднік, нейтральны транслятар ведаў, а як інтэрпрэтатар тэкстаў з пазіцый «сацыяльнага заказчыка» або сваіх уласных. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў падрыхтоўцы і развіцці рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якая мае на мэце ацаніць дакументны паток па праблеме, адабраць лепшае, адзначыць каштоўнасныя характарыстыкі дакумента і г.д. Менавіта з дапамогай крыніц гэтага віду бібліяграфіі вырашаецца задача, якую ставіць грамадства перад сацыяльнымі інстытутамі, – далучэння сваіх грамадзян да сапраўдных духоўных каштоўнасцей.

Новыя сацыяльна-эканамічныя і тэхнічныя ўмовы таксама ўплываюць на развіццё гэтага віду бібліяграфіі і характар каштоўнасна-арыентацыйнай дзейнасці бібліёграфа. Змянілася мэтавая накіраванасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якая з інструмента прапаганды з характэрнымі для яе метадамі, прыёмамі і сродкамі пераўтвараецца ў экспертную сістэму, мэтавае прызначэнне якой інфармаваць карыстальнікаў аб дакументах, кіруючыся прынцыпам якаснага адбору інфармацыі з улікам канкрэтнага чытацкага адрасу. З дапамогай рэкамендацыйных бібліяграфічных сродкаў ёсць рэальная магчымасць гарманізаваць патрэбнасці карыстальнікаў у каштоўнаснай інфармацыі з патрэбнасцямі дзяржавы ў далучэнні сваіх грамадзян да сапраўдных духоўных скарбаў, назапашаных чалавецтвам. Чалавек жыве ў новай інфармацыйнай сітуацыі, калі, з аднаго боку, ведаў недастаткова і ў той жа час яны празмерныя. Недастатковасць звязана з тым, што захоўваецца адчуванне нявызначанасці ўмоў існавання, у якіх ускладняецца працэс прыняцця рашэнняў. Празмернасць абумоўлена колькасным накапленнем інфармацыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яе змястоўнай супярэчнасцю, мноствам мала- ці зусім некаштоўных і фальсіфікаваных звестак, якія навязваюцца чалавеку праз СМІ, Інтэрнэт, іншыя крыніцы. У гэтых умовах нельга не бачыць важную функцыю бібліяграфіі – каштоўнасна-арыентацыйную, якая знаходзіць сваё выражэнне ў прапаноўваемай тэматыцы бібліяграфічных крыніц, адборы прапаноўваемых дакументаў, іх якасных характарыстыках.

Важнай рысай сучаснай рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці з'яўляецца і той факт, што на змену парадыгме жорсткай прымусовай аднанакіраванай рэгламентацыі чытання ў наш час прыходзіць парадыгма вольнай бібліяграфічнай самаарыентацыі, калі бібліёграф стымулюе індывідуальны выбар карыстальніка, раскрывае перад ім усю разнастайнасць тэкстаў, дае магчымасць знаёміцца з дакументамі, якія змяшчаюць альтэрнатыўныя канцэпцыі, не ўтойваючы пры гэтым уласныя адносіны да культурных з'яў, уласныя прыярытэты; новыя тэхналогіі даюць магчымасць з дапамогай гіперспасылак пастаянна пашыраць працэс пазнання спажыўца.

Для разумення значэння і асаблівасцей рэалізацыі ацэначнай функцыі бібліяграфічнай інфармацыі неабходна ўлічваць, што пры ажыццяўленні каштоўнасна-арыентацыйнай дзейнасці, акрамя ўласных суб'ектыўных ацэнак, бібліёграф арыентаваўся і арыентуецца на даныя адпаведных навук, водгукі аўтарытэтных спецыялістаў пэўных галін ведаў, на ацэнку дакументаў з боку навуковых рэдактараў бібліяграфічных дапаможнікаў, крытычна-аглядныя публікацыі. Разам з тым, нягледзячы на развіццё плённага супрацоўніцтва са спецыялістамі, якія ажыццяўляюць экспертызу дакументнага патоку па розных галінах ведаў – літаратурнымі крытыкамі, журналістамі і інш., трэба разумець, што часта мэтавая накіраванасць іх дзейнасці розная. Нельга не заўважыць яшчэ адну тэндэнцыю ў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Сёння дзякуючы новым інфармацыйным тэхналогіям у якасці «сукупнага» бібліёграфа выступаюць самі карыстальнікі, якія ацэньваюць прадстаўленыя ў бібліяграфічных крыніцах дакументы, выказваюць свае меркаванні аб прачытаным, што пашырае кола суб'ектаў бібліяграфічнай каштоўнасна-арыентацыйнай дзейнасці.

Тэхналагічныя, метадычныя асаблівасці развіцця рэкамендацыйнай бібліяграфіі на сучасным этапе ў новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах, звязаныя з сінтэзам у бібіяграфічных дапаможніках розных відаў інфармацыі, пашырэннем аб'ёму фактаграфічнай інфармацыі, разнастайнасцю жанравай структуры бібліяграфічных крыніц, засваеннем новых каналаў прадастаўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі – сеткавых, разглядаліся мной і выкладзены ў спецыяльным артыкуле [3].

Развіццё метадалогіі пазнання бібліяграфіі актуалізуе пытанне аб змесце, крытэрыях бібліяграфічнай ацэнкі дакументаў. Зразумела, што каштоўнасць дакумента і каштоўнасныя адносіны да дакумента, каштоўнасць і ацэнка – паняцці не сінанімічныя. А. П. Коршунавым пры распрацоўцы праблем агульнай тэорыі бібліяграфіі і характарыстыцы бібліяграфічнай рэалізацыі каштоўнасных адносін быў дакладна вызначаны карыстальніказнаўчы падыход. Ён падкрэсліваў, што практычная рэалізацыя ацэначнай функцыі залежыць як ад зместу дакумента, так і зместу характарыстык карыстальнікаў. Ніводнага дакладнага кроку ўнутры рэкамендацыйнай бібліяграфіі нельга зрабіць, застаючыся на шляху недыферэнцаваных уяўленняў аб чытачы. Бібліяграфічная рэалізацыя каштоўнасных адпаведнасцей (ацэначная функцыя) пераносіць цэнтр цяжару на спажыўца, на яго спецыфічныя асаблівасці і патрэбнасці [4, с. 98–100]. Асэнсаванне дадзенай ролі карыстальніка патрабуе ад бібліёграфа ведання сацыяльна-псіхалагічных характарыстык, інфармацыйных патрэбнасцей, пераваг у адносінах да інфармацыі. Інфармацыйныя патрэбнасці дынамічныя. І тут неабходна арыентавацца як на вынікі самастойна праводзімых бібліятэкамі маркетынгавых даследаванняў, так і на вынікі, атрыманыя сацыялогіяй культуры, на развіццё дыягнастычнага кірунку ў бібліяграфазнаўстве.

У культуралагічным падыходзе М. Г. Вохрышава звяртае ўвагу на такі яго спецыфічны атрыбут пры ажыццяўленні практычнай бібліяграфічнай дзейнасці, як аксіялагічны аналіз дакументаў. «Каштоўнасці, – указвае даследчык, – з’яўляюцца сутнаснай характарыстыкай любой культуры. У ёй прысутнічае ацэнка, і ў першую чаргу ацэнка твора, асэнсаванне яго месца ў грамадстве ў суадносінах з эпохай; ацэнка асобы творцы, адпаведнай творчай школы» [2, с. 310]. На ацэнку дакументаў уплываюць тры групы фактараў. Па-першае, усталяваныя, выпрацаваныя ў дакументазнаўстве, бібліяграфазнаўстве крытэрыі, эталоны ацэнкі дакументаў, да якіх адносіцца сукупнасць аб’ектыўных каштоўнасных якасцей, такіх, напрыклад, як арыгінальнасць, паўната, дакладнасць, даступнасць, зразумеласць, актуальнасць, адпаведнасць змястоўным і функцыянальным чытацкім патрэбнасцям (пертынентнасць, рэлевантнасць). Па-другое, сістэма каштоўнасцей соцыуму, якая дэтэрмінуе дзейнасць бібліёграфа светапоглязднымі ўстаноўкамі, нормамі, правіламі, прынятымі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадстве, сацыяльнымі інтарэсамі, што ўплываюць на індывідуальныя ацэнкі. Менавіта тут фарміруюцца крытэрыі аднясення тых ці іншых з’яў да разраду найбольш значных, каштоўных і пераважных у дадзены момант, час. І трэцяя група фактараў звязана непасрэдна з суб’ектам бібліяграфічнай дзейнасці, яго індывідуальнай сістэмай каштоўнасцей, поглядамі, густамі, псіхалагічнымі і эстэтычнымі характарыстыкамі.

Існаванне розных метадалагічных падыходаў, безумоўна, узбагачае бібліяграфазнаўства, практычную бібліяграфічную дзейнасць, сферу падрыхтоўкі бібліяграфічных кадраў для ажыццяўлення працэсу бібліяграфавання. Разам з тым можна канстатаваць, нягледзячы на наяўнасць асобных даследаванняў у гэтым кірунку [5], неабходнасць вылучэння ў якасці самастойнага інфармацыйна-аксіялагічнага падыходу, які яшчэ не ў поўнай ступені асэнсаваны, выкарыстаны для тлумачэння бібліяграфіі і практычнай бібліяграфічнай дзейнасці, яе значэння для сацыяльна-камунікатыўных працэсаў.


1. *Басов, С. А.* Библиотека : формирование базовых ценностей на переломе эпох / С. А. Басов // Роль библиотек в формировании регионального социально-культурного пространства : сб. науч. тр. / ГПНТБ СО РАН. – Новосибирск, 2009. – 312 с.

2. *Вохрышева, М. Г.* Теория библиографии : учеб. пособие / М. Г. Вохрышева. – Самара : СГАКИ, 2004. – 368 с.

3. *Зыгмантовіч, С. В.* Рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк Рэспублікі Беларусь / С. В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2010. – № 8. – С. 54–61.

4. *Коршунов, О. П.* Проблемы общей теории библиографии : монография / О. П. Коршунов. – М. : Книга, 1975. – 191 с.

5. *Сафиуллина, З. А.* Информация : ценность и оценка : науч.-практ. пособие / З. А. Сафиуллина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 224 с.

6. *Фокеев, В. А.* Библиография : теоретико-методологические основания : учеб. пособие / В. А.Фокеев. – СПб. : Профессия, 2006. – 352 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ